№ 79 Ausgabe B.

ГОМАН

№ 79 (275). Год III. Вільня, 8 кастрычніка 1918 г. Цана 10 фэн. (5 кап.)

ТЭЛЕГРАМЫ.

7 кастрычніка.

Заходні тэатр.

Фронт ф. Гальвіца: Паміж Аргонамі і Маас амэрыканцы прадаўжалі свае заўзятыя атакі; яны адбітэ з вельмі цяжкімі стратамі.

БЭРЛІН. З весткаў „Berliner Tageblatt“ з Жэневы француcкі ўрад катэгорычна адкланяе мірнае прадлажэньне Нямеччыны.

Італьянская прэса, відаць з заду свайго ўраду, зусім не ўпамінае аб мірным прадлажэньні. Руская і ўкраінская прэса вітаюць гэты крок з вялікаю сымпатыяй.

СОФІЯ. Баўгарыя распускае ўсю сваю армію з выключаньнем ваеннай стражы у Добруджы і на усходняй граніцы.

БЭРЛІН. Газэты адзначаюць у сваіх перадавіцах паважнасьць хвіліны і цяжар пастановы, што зьмяшчаецца ў пасланай Вільсону ноце, але яны аднагодна падчырківаюць канечнасьць нязломнае пастановы супроць волі ворага зьніштожыць Нямеччыну. Клерыкальная „Гэрманія“ выказуе, што мірны крок адказуе, шмат раз выказанаму пункту гледжаньня Вільсона. Нямецкі народ чакае з надзеяй але і з поўную адвагай. Ўмяркаваная „Vossische Zeitung“ выказывае што прапушчаны момэнт простых перагавораў з Францыяй аб Эльзас-Лётарынгіі, не выкарыстаны выпадак умовіцца у апошні час з Расеяй у пытаньні аб акраінных дзяржавах. Вольнамысьльная „Freisinnige Zeitung“ піша, што за канцлерам стаіць уся нацыя, так сама найвысшая каманда. «Berliner Tageblatt» заяўляе, што за ўсю вайну гэта першы раз з вуснаў чалавека, што стаіць на высокім мейсцы, мы пачулі зусім адкрытую, без усялякае драбязы прамову. Трэба асьцярагаць перад лішнім оптымізмам і сьмела чакаць канца, які-бы ён ня быў. Калі унутраныя ворагі цяперашняга ураду захочуць выкарыстаць неўдачу цяперашняга мірнага кроку, то гэтая мэта ня будзе асягнута. Офіцыёз соцыяльдэмократаў. „Vorwärts“ выказуе, што дэмократычная мірная палітыка у нямецкім народзе не мае праціўніка, але мае ворага ў саюзьніках Амэрыкі. Нямецкая армія спраціўляецца не ўсесьветнай дэмократыі але імпэрыялізму саюзьнікаў. Гэтае спраціўленьне будзе цягнуцца да таго часу, пакуль ня шчэзьне жаданьне саюзьнікаў разьбіць нямецкі народ.

Правыя газэты рэзка выказываюцца проці кроку ўраду. Адналька крок гэты зроблены і патрыётычны абавязак усіх старацца аб яго ўдачы. Консэрватары хочуць пачэснага міру. Нямецкі народ згодзіцца на барацьбу на жыцьцё і сьмерць, калі адказ ворагаў пакажа, што яны й далей маюць волю зьніштожыць Нямеччыну. Аграрная „Deutsche Tageszeitung“ кажа аб „просьбе аб міры“ з боку неперамožанай Нямеччыны. „Прыгожыя словы канцлера ня зробяць уплыву на заграніцу і закрыюць толькі туманом нашую нацыянальную думку“. Усенямецкае „Tägliche Rundschau“ піша: „Хай удача гэтага кроку змусіць замоўкнуць нашае сумлеваньне; хутка мы даведаемся з адказу Вільсона, ці запраўды яго людзкае сумленьне такое жывое, як гэта думае канцлер“. Правая „Berliner Neueste Nachrichten“ піша: „Калі нашы ўрад і вышэйшая каманда ня лічылі пажаданым яшчэ адзін год крывавых ахвяр, то ўсёткі ня трэба было-б выпускаць з рук усіх козыраў. Мы бачым нашы народ пад фатальнымі правадыралі“. Вольнаконсэрватыўная „Post“ піша вельмі неўздаволеная: „Ці-ж было так недабходна браць на сябе гэтакі стыд, каб зь'еднаць бацькаўшчыны і армію ў нязломленным адпоры. Нямецкія дэмократы дастануць удар сьмяротны для нямецкіх ільлюзый аб згодзе“. Усенямецкая «Deutsche Zeitung» кажа аб „трудным ярме для дзяржавы“. „Хутка прыйдзе момэнт суду над палітыкаю, што нас падвяла пад яго“. Прыдворны „Lokal Anzeiger“ піша: «Увесь нямецкі народ будзе біцца да апошняй каплі крыві праціў таго, хто асьмеліцца прадлажыць нам стыдны мір“. Офіцыёз ураду „N. D. A. Z.“ напамінае, што ўсе ранейшыя спробы ўмовы былі адкінуты ворагамі. Такім парадкам няведама, ці гэты новы крок удасца. Але тады з прычыны зрабіўшагася зьеднаньня паміж народам і ўрадам сілы нямецкага нанароду разаўюцца да тое ступеньні, што ўсе непрыяцельскія нападкі будуць зусім разьбіты.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 5.Х. З запрошаньня міністэрства міжнародных справаў учора сюды прыехала 14 фінаў. Іх сустрэлі на вагзале і праводзілі у готэль. Учора вечарам быў у міністэрстве баль. Сёньня раніцай быў прывет ад тутэйшага ураду, які устроіў ім банкет. Сёньня вечарам ім дадуць опэрнае прадстаўленьне. У аўторак яны едуць у Ену, Кассэль, Кэльн, Эссэн, Кудэсгайм, Франкфурт і Гэйдэльбэрг.

КАРЛЬСРУЭ (В.Т.Б.). 5 Х. Канцлер, прынц Макс Бадэнскі, паслаў вялікаму гэрцагу бадэнскаму тэлеграму, у якой паміж іншым кажа: „Яго Вялікасьць Імпэратар назначыў мяне канцлерам Нямеччыны. У цяжкую гадзіну трэба прынясьці ўсякую цяжкую ахвяру, якую вымагае ад нас Імпэратар і дзяржава. Дзеля гэтага я пайшоў за прызывам, што паставіў мяне на гэты пост. „Толькі дабравольнае зьеднаньне і адданьне сябе Нямеччыне можа прывясьці да лепшае палітыкі“.

АМСТЭРДАМ. 5.Х. (В.Т.Б.). Водлуг вестак з Вашынгтону Лянсінг атказаў на грозьбу нямецкага ўраду расстрэліваць амэрыканскіх ваенна-палонных, у каго будуць знайдзены шротовыя стрэльбы, так: „калі Нямеччына хоць у адным прыпадку споўніць гэтую грозьбу, то гэта права і абавязак Амэрыкі адказаць тым самым дзеля абароны амэрыканскага войска; таму абвяшчаецца, што амэрыканскі ўрад пастанавіў рабіць таксама“. Лянсінг цьвердзіць што ў параўнаньні з другімі істнуючымі ваеннымі прыладамі проціў ужываньня шротных стрэльбаў нельга выставіць ніякіх прычын.

ВЕЛГРАД. Проціў ваеннага губэрнатара Сэрбіі, енэрала Рэміна, 20 летняя кабета зрабіла напад, які аднолька-ж не ўдаўся.

Вільня, 8 кастрычніка 1918.

Пяты год вайны... Калі вайна пачалася, блізка што нікому і ўдум не прыходзіла каб, яна магла цягнуцца так доўга. Казалі, што людзей паб'юць, і ня будзе каму ваяваць, што ня хопіць чаго есьці, што ня будзе з чаго страляць; думалі, што хутка адзін другога сходае, разаб'е войска, пабярэ землі і сталіцы—і будзе мір. Адным словам, шмат чаго казалі і думалі і кожын раз прарочылі, што вайна кончыцца за год, але кожын раз памыляліся. Найважнейшае, што ворагі аказаліся блізка што на роўнай сіле і дагэтуль зьбіць аднаму другога не ўдавалася і дагэтуль заўзята дзяруцца.

Каб вайна скончыўшыся хутка, яна, можа быць, прынясла-б таму, хто яе выграў-бы вялікія карысьці. Гэтак кожын і думаў, што ён здужае другога, адбярэ, якія захоча землі і месты, змусіць заплаціць сабе яшчэ контрыбуцыю, значыць вярнуць сабе кошты вайны, і будзе панаваць на сухапуцьці і моры.

Аднолька-ж усе памыліліся і апрача нязьлічаных бед і неапісанага няшчасьця вайна нічога не дала.

Пачынаем ад людзей. Ва ўсіх ваюючых дзяржавах забраныя на вайну блізка ўсе здаровыя мужчыны. Астаюцца толькі менш здольныя да працы: старыя, малыя і жанчыны. Увесь квет маладзяжы ваюючых народаў скошаны на палёх бітвы, і айцы даўно ўжо пайшлі замяняць сыноў. Пайшлі айцы, бяруць і наймалодшых. Колькі забіта, а колькі пакалечана, а яшчэ больш на ўсё жыцьцё патраціўшых здароўе. Проста страшна падумаць аб будучыне: якое патомства будзе з такога народу. Французы дагэтуль дужа часта наракаюць на Напалеона, што ён так шмат спусьціў крыві францускаму народу, абліўшы ею блізка ўсю зямлю. Разумеецца, што гэта вельмі аслабіла францускую нацыю і затрымала ўзрост яе насяленьня. А што будзе пасьля гэтае вайны? Бяда таму народу, што дарма тачыў сваю кроў за лятуценьні панаваньня над сьветам! Бяда таму ўраду, што больш думаў аб скрынях золата, як аб крыві сваіх падданых! Будучына ўсё ўспомніць, і ўсё палічыць і праклянець таго. хто быў вінавайцам гэтае крывавае бойні.

А жывёла? І яе шкода. Колькі выбіта каней; колькі памарнавана іншае жывёлы—пабіта і парэзана бяз усякага толку пры ўсялякіх адступленьнях і наступленьнях. На тое каб загадаваць яе йзноў, трэба будзе ня менш пяці гадоў.

Месты і сёлы паразьбіваны і папалены. Цэлыя гасударствы і народы зьніштожаны: Бэльгія, Сэрбія і інш. Там дзе былі найлепш уробленыя полі, дзе ўсё квіцела і зелянела цяпер перакапана, перарыта акопамі і цяжкімі снарадамі. Хаты папалены, сады паламаны, лес парубаны і павывaрачаваны. Поўны абраз спустошаньня! Гетак ня толькі ў нас, але ўсюды дзе толькі ішла і йдзець вайна. Падумаць, як выглядае цяпер фронт у Францыі, дзе праз чатыры гады таўкуцца то ўзад, то ўперад на адным мейсцы? Нічога там не засталося ні з местаў, ні з вёсак, ні з сьвятыняў, а ні з памяткаў культуры. Усё ў руінах, ўсё пад попелам. Уся гаспадарка зруйнована. Замест таго, каб рабіць што патрэбна для карыснага ўжытку, уся праца і ўсё багацьце праз гэтыя чатыры гады вайны былі зьвернуты на вайну: усё і ўсё на вайну! Ня кажам таго, што дзесяткі мільёнаў людзей адарваны ад сваей працы а іх яшчэ трэба карміць, апранаць і трэба ім плаціць. Ня хутка і посьля вайны наладзіцца ўся гаспадарка, доўга яшчэ ня будзе хапаць найпатрабнейшых рэчаў да жыцьця людзкога, пачынаючы ад хлеба і канчаючы на газе. Доўга яшчэ будуць сядзець жыхары места бяз хлеба й папацёмку, а гаспадары бяз жывёлы і гаспадарскіх прыладаў. Прывязьці таксама ня-будзе скуль, бо ўвесь сьвет загарэўся вайной, і ня будзе чым, бо хіба што добрая палова ўсіх караблёў патоплена.

Народ змучаны, аслабеўшы—да яго ліпнуць усякія хваробы. Успомнім толькі, што ў самым Бэрліне, дзе усе заразныя хваробы даўно былі выведзеныя, цяпер раптам 7 выпадкаў азыяцкае халеры, з іх 6 сьмяротных. З'явілася ў Гішпаніі і пашла па ўсім сьвеце гішпанская трасца. Дактары добра ня ведаюць, што гэта за хвароба: баяцца, каб пасьля яе ня прышла горшая якая пошасьць. Усё затое, што народ слабы: шмат працуе і блага есьць.

Але найгорш заўсё, што людзі ў гэтай вайне, рэжучы і забіваючы адзін другога, патрацілі сумленьне. Ужо і ў нас пашлі разбоі і рабункі, а што дзеялася і дзеецца ў Расеі? Зладзействы і забойствы — звычайнаю рэччу. Да таго-ж у часе вайны папсаваліся ўсе парадкі, дзеля гэтага кожнаму лягчэй украсьці і скруціць. Пашло зладзейства і крyцельства, якого сьвет ня бачыў.

Вось што дала вайна. А каму якая карысьць? Мо адна Японія можа пацешыцца, што блізка зусім не ваяваўшы, набрала поўныя кішані золата. Але гэтак больш хіба што нікому неўдалося пагрэць рукі на чужым няшчасьці, бо Англія і Амэрыка змушаны былі кінуць прыглядацца з далёку і самі ўзяцца за вайну. Кожын цяпер павінен сказаць, што гэтая вайна—гэта самагубства для ўсіх народаў, для ўсяе Эўропы і яе культуры. Чым хутчэй яна скончыцца, тым ляпей будзе для ўсяго сьвету. Трэба толькі, каб яна скончылася справядліва, каб усе народы дасталі, што ім належыц-

па, трэба, каб быў заложаны моцны фондамэнт да іх згоднага супольнага жыцьця.

Гэта, здаецца, ўжо першы зразумеў нямецкі народ. Апошнія важныя выпадкі і перамены ў Нямеччыне паказуюць гета. Нямецкі народ, захацеўшы, цяпер, справядлівага міру, дастаў ад свайго Імпэратара згоду на тое, каб давераныя прадстаўнікі народу ўвайшлі ва ўрад дзяржавы кіраваць справамі свае бацькаўшчыны. Гэта вельмі важная перамена, якая можа і павінна мець дужа вялікае значаньне для хутчэйшага канца вайны. Бо зразумела, што прадстаўнікі народу ня могуць і ня маюць моральнага права працягнуць вайну залішне хоць бы на адзін дзень. Значыцца, цяпер Нямеччына будзе старацца, каб увайсьці ў перагаворы з Францыяй і ўсімі яе саюзьнікамі аб заключэньні міру. Тады ўжо яе ворагі павінны будуць верыць, што яна шчыра хоча міру для ўсяе Эўропы і павінны будуць зрабіць замірэньне. Інакш і іхныя народы могуць узбунтавацца, не захочаць ліць свае крыві на аўтар імпэрыялістычных лятуценьняў сваіх урадаў. Бо калі-б саюзьнікі нязгодзіліся на замірэньне, то немцы яшчэ маюць сілы бараніцца, і вайна можа працягнуцца...

Як я зрабіуся беларусам.

Можа дзіўнае даю сабе пытаньне, не адзін падскажыць мне чытач, але я скажу зразу: не дзівіся пабабску, а паслухай маю гутарку да канца.

Быў я доўгія годы як казалі мае суседзі і знаёмыя, добрым „паляком": хадзіў акуратна ў касьцёл, чытаў шмат і ахвотна польскія кніжкі і газэты, а навет служыў у польскай канцэлярыі, „еў" польскія грошы. У газэтах і з амбоны ў касьцёле чуў шчырыя мовы, што больш усяго гэта трэба любіць Бога, касьцёл каталіцкі і—бацькаўшчыну.

— Ах ты здрайца! чаму ж цяпер выракся каханьня бацькаўшчыны! ізноў можа закіне мне чытач, дабавіўшы: чаму цяпер кажаш, што твая бацькаўшчына ня Польшча, а . . . Беларусь...

— Паночку! знову перабіваеце маю гутарку, будзьце-ж ласкавы мець цярплівасьць да канца выслухаць мае словы.

— Яшчэ раз кажу, што мне надта падабаліся тыя газэты і мовы, але... там паказывалі мне Варшаву, Кракоў, там чыталі мне харошыя кніжкі Міцкевіча, Крашэўскаго, Родвевічаўны і другія, так як у школі казалі чытаць мне таксамя харошыя кніжкі Пушкіна, Дастаеўскаго, Талстога і другіх аўтараў. Сапраўды, дужа цэнныя гэта аўтары, але я ўсёж пытаўся сябе — ці яны чулі і ведалі маю тутэйшую мову—беларускую - як кажуць звысока, простую, хамскую. Пытаўся сябе—ці ўвіджу я калі гэтыя месты Варшаву і Кракоў? і адказаваў тут жа сабе: што яны надта далёка ад майго места і вёскі, што мільёны тутэйшых грамадзян жывуць і ўміраюць ня бачыўшы іх, бо і ня шукалі — на што шукаць, калі пад бокам свае тутэйшыя ёсьць месты і вёскі і касьцёлы, дзе так сама жывуць, прапуюць і моляцца Богу. Адну толькі розьніцу кожны ў гэтым бачыў, хто меў спосаб пабываць у Польшчы ці ў Расеі, што там па вёсках так сама гавораць, як і па местах—і паны і селяне. А тут у нас? тут наш сабрат зусім іншай гаворыць мовай, няжэлі паны і вучаныя, бо яны так гавораць, як іх вучылі ў школах прыблудныя вучыцелі з Расеі ці Варшавы, пераламаўшы зусім іх родны язык на новы фармат, і вы хадзіла тое, што калі кончыш школу, так ужо рабішся нібы новым чалавекам, называючыся ці „паляком" ці „рускім". Калі веры быў каталіцкай, так у грамадзянскіх дакумэнтах называлі цябе «паляком», а калі мой калега з адной вёскі, толькі праваслаўнай веры, кончыў разам са мной школку, то яго ўжо поп называў «рускім». Тык дзеж тут праўда? як-жа называць сябе тутэйшаму люду?

— Відзіш, чытач, дзе пачатак майго адраджэньня, але і гэтага мала: паслухай далей.

— Тут я зразумеў, што кожны люд мае свою адну маці, свою адну бацькаўшчыну і што дзіця можа астацца сіроткай, але люд, як нацыя, ніколі не астаецца сіроткай: уся тая зямелька і вадзічка ў рэчках і тыя такія харошыя фірмамэнты неба ў дзень, ці у ночы, што яго акружаюць, як вока толькі можыць зірнуць, —гэта яго родненькая маці, яго родная бацькаўшчына, яна адна толькі маці і для мяне і для майго колегі!.

Ад гэтага часу вось я ўжо свядомы чалавек, беларус. Як-жа цяпер лёгка на душы і сэрцы: і сам не важышся і другім сьмела гаворыш, хто ты такі, хто твая бацькаўшчына, дзе ты радзіўся, жывеш і дзе хочаш памерці, і так сама акуратна ходзіш у касьцёл і яшчэ шчырэй молішся, бо спаў камень з сэрца.

Міхалка Гайно.

Дванаццаць гадоу істнаваньня беларускага пэрыедычнага друку.

У 128 нумары «Беларускага Шляху» А. Новодворскі піша аб дванаццатым юбілеі беларускага пэрыёдычнага друку:

«Занятыя важнымі палітычнымі справамі мамэнту, аглушаныя громам калышучых сьвет падзеяў, мы і не заўважылі і абмінулі наш важны нацыянальны юбілей. — Можа дзеля таго, што ня водзіцца у сьвеці каб спраўляць дванаццаці гадовыя юбілеі, але нам, каторым кожны год істнаваньня пэрыёдычнай часопісі каштаваў больш чым вольным народам каштуе істнаваньне вялізнай багатай выданьнямі пэрэёдычнай прэсы — нам ня сьлед узірацца на чужыя традыцыі.

Перад маімі вачыма на стале ляжыць другі нумар першай беларускай газэты „Наша доля" ад 15 верасьня 1906 году. Перадавога артыкулу, які гаварыў бы аб мэтах рэдакцыі німа у ім —бо гэта другі нумар — але мэты гэтыя даволі характэрызуюцца тым, што газэта назначаецца, «для вясковага і местовага рабочага народу», а ў канцы тэксту стаіць паведамленьне ад рэдакцыі што палавіна выданьня першага нумару, 5 тысячаў, паліцыя забрала («так што нічога схаваць не удалося»).

І з першых-жа выступленьняў беларуская прэсса паказала свой шляхэтны напрамак; вось у № 2 гарачы артыкул проці жыдоўскіх пагромаў, да каторых клікалі у той час чорнасотніцкія правадыры. Есьць артыкулы Антося Асіны, Дзядзкі Каруся (К. Каганца) надрукованы вершы Я. Коласа — «Асеньні вечар». («Вые бура лэс гаманіць»...) Дзядзькі Пранука — «Вецер».

Глядзячы на гэтыя пажоўклыя ад часу і усялякіх прыгодаў лісьцікі думаеш сабе: што думалі яны, гэтыя Кірыллы і Мяфодзіі беларускай пэрыёдычнай прэссы глядзячы на першыя адбіткі свайго выдруку. Якімі вачыма з якім трыумфам за Беларусь, каторая дачакалася сваей газэты, угледаліся у іх?

А параўнаньне таго, што было у 1912 годзе — адна тыднёвая газэта, з тым, што ёсьць цяпер, калі мы маем «Гоман», «Вольную Беларусь», «Дзянніцу», «Беларускі Шлях», «Беларускае Эхо» і на палавіну друкаваны па расейску у Пецярбургу «Чырвоны Шлях» — 1 штодзенную, 1 трохдзенную, 2 тыднёвых газэты, 1 літэратурны тыднёвік і 1 літэратурна-палітычны двухтыднёвік, і ў хуткім часе будзем мець два месячнікі — «Вэрту» і «Крывічаніна» — гэтае параўнаньне кажа мне, што час ня зьвёў надзеі тых, што працавалі над «Нашай Доляй». Яна не загіне"!

Так—у параўнаньні да таго, што было у першых гадох, вялікі поступ! Найбольш пашырылася беларускае пэрыёдычнае выдаўніцтва за апошні год. Прычына зусім зразумелая. Разьвіцьцё і пашырэньне грамадзянскай працы, рост беларускага руху, які загортуе пад свой бела-чырвоны штандар усё большыя і шырэйшыя колы беларускага народу. Лік газэт і часопісаў хутка павялічываецца. Але трэба прызнацца, што мы яшчэ вельмі далёкія да таго, каб кожны беларус чытаў беларускую газэту. Аб гэтым цяперака навет і гаманіць нельга, бо і чытаць умеюць далёка ня ўсе. А тыя, што ўмеюць чытаць, чытаюць найчасьцей расейскія ці польскія газэты. На гэта складаюцца розныя прычыны. Раз, што не да ўсіх дайшла яшчэ нацыянальная сьведамасьць, другі, от—проста з прывычкі; трэці — у гэтым разе дужа часта вінная сама беларуская газэта. А віна беларускіх газэт, што яны расходзяцца ня так шырока па між шырокіх беларускіх мас, як маглі-б, такая: усе беларускія газэты, якія цяпер выходзяць, гэта ня ёсьць газэты для простага сялянскага народу, бо пішацца яны так, што іх могуць чытаць толькі вучоныя, інтэлігэнты. У іх вельмі шмат чужаземных словаў, якія трэба было б або замяняць беларускімі, або аб'ясьняць іх так, каб кожын мог зразумець. Ды й тое, што пішацца, не для ўсякага зразумела. Ведама, інтэлігэнцкія газэты так сама патрэбны. Ужа зьявілася беларуская інтэлігэнцыя, якая вымагае жывога беларускага слова. Інтэлігэнцкая газэта разьвівае, ўзбагачае мову й спасобіць яе да здольнасьці выражаць самыя зложаныя думкі (ня няшчасьце яна так часта псуець і калечыць мову!). Дзеля ўсяго гэтага патрэбны інтэлігэнцкія газэты. Але побач з гэтым мы павінны не забывацца, што шырокія народныя массы павінны у нас быць на першым пляне, што перш за ўсё мы павінны да іх ісьці з родным беларускім словам. Трэба, каб такое слова было чыстае, шчыра беларускае, простае і зразумелае. І вось такой газэты мы цяпер ня маем. Гэта вельмі блага. Такую газэту трэба стварыць доўга не чакаючы, ня глядзячы на тое, што на гэта трэба мець спэцыяльную і вялікую здольнасьць каб пісаць «простай» для ўсіх зразумелаю мовай. Такія людзі павінны знайсьціся.

Беларускія справы.

Беларуская дэлегацыя.

Менскія беларускія газэты даюць знаць, што ў Кіеў у палітычных справах паслана Надзвычайная Дэлегацыя Беларускай Народнай Рэспублікі.

Тэкст пратэсту, уручанага Ракоўскаму і украінскаму ўраду:

«Вялікая ўсесьветная вайна адным з сваіх насьледкаў мела прызнаньне усімі ваюючымі дзяржавамі прынцыпу самаазначэньня народаў і адбудовы гістарычна істнаваўшых дзяржаўных арганізацый.

Адным з першых правёў гэты прынцып у жыцьцё народ беларускі, які ў асобе свайго паўнамочнага органу — *Рады Беларускай Народнай Рэспублікі*, атрымаўшай сваю ўладу ад 1-го Усебеларускага Нацыянальнага Конгрэссу ў Менску 17—31 сьнежня 1917 году, абвясьціў актам 25-го марца гэтага году *Незалежнасьць і Непадзельнасьць Беларусі* ў яе этнографічнагістарычных межах. Аб гетай пастанове Урад Беларускі апавясьціў усе вялікія дзяржавы, высылаючы пры гэтым пратэст супроць падзелу Беларусі Берасьцейскай умовай. Разам з тым Урад Беларускі прасіў усе вялікія дзяржавы прызнаць дзяржаўную незалежнасьць Беларусі.

Ня глядзячы на гэта, апошняя дадатковая ўмова паміж Расіяй і Нямеччынай, падпісаная ў Бэрліне 10-го жніўня гэтага году ізноў наносіць удар у толькі што утварыўшайся Беларускай дзержаўнай арганізацыі, адрываючы ад яе паўночна-ўсходнюю акраіну,—да ракі Бярэзіны.

Тым часам люднасьць гэтае тэррыторыі, неразрыўна зьвязаная і гістарычна, і эканамічна, і нацыянальна і культурна з рэштаю Беларусі, праз вусны сваіх дэлегатаў на Усебеларускім Нацыянальным Конгрэссі ясна выявіла сваю волю стнавіць разам з іншымі часткамі Беларусі адзін дзяржаўны арганізм.

Пры прадажы запісаў армейскага і флоцкага ўпраўленьня, якія больш не патрэбны для ваенных мэтаў, сплата можа быць зроблена паперамі ваеннае пазыкі. Гэты загад датычыць усяго, што аслабаняецца для цывільнае люднасьці, г. з.: каней, павозак, упражы, палявых чыгунак, маторных лёкомобілей, матораў з прыналежнасьцямі, сельска-гаспадарскіх машын з прыладамі, фабрычных устаноў з машынамі і прыладамі, жалеза, сталі і другіх мэталаў, дрэва і іншага будоўніцкага матэрыялу, матэрыялу да пражы і ўсялякай суравізны.

Купцы, што плацяць паперамі ваеннай пазыкі, маюць пры іншых роўных умовах першасьць. Паперы ваеннай пазыкі прымаюцца водлуг поўнага номіналу (абазначаная вольнасьць) на ўсім пакупную суму. — Паперамі ваеннай пазыкі прызнаюцца ўсе дзяржаўныя 5% даўгавыя аблігацыі а таксама выданыя, пачынюачы ад 6-е ваеннае пазыкі, $4^1/_2$ працэнтныя тыражныя скарбовыя запісы.

Гэта знача: толькі паперы ваеннае пазыкі, а не налічныя грошы даюць гарантыю, што земляроб, або прамысловец, можа дастаць з аслабаніўшыхся ваенных матэрыялаў тое, што яму патрэба,.

Змучаны пажарам вайны, зруйнаваўшай яго на часьці, народ беларускі, узлажыўшы ўсе надзеі на магчымасьць свайго адраджэньня толькі на злучэньне ўсіх беларускіх зямель і адбудову сваей утрачан‹ай дзяржаўнасьці, бачыць у новым акце падзелу Беларусі пагрозу самому свайму нацыянальнаму істнаваньню, і перад усім цывілізаваным сьветам выстаўляе дамаганьне, каб усе беларускія землі, як ужо пакінутыя так і тыя, што маюць быць пакінуты нямецкім акупацыйным войскам, а таксама занятыя суседнімі дзяржавамі, былі аддадзены незалежнай Беларускай Дзержаве».

Апрача таго Беларуская Дэлегацыя была ў адведзінах у таварыша міністра загранічных спраў Украіны О. Эйхэльмана і вяла з ім дзелавую гутарку. Дэлегацыя мае таксама адведзіць прадстаўнікаў іншых дзяржаў.

Цэнтральная Беларуская Тарговая Палата.

Таргова-Экономічная Дэлегацыя ў асобе сэкрэтара таргоўлі і прамысловасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Ф. Вернікоўскага і старшыні Цэнтральнай Бел. Тарг. Палаты А. Крэчэўскага, закончыўшы сваю місію, 27 верасьня вярнулася ў Менск.

З украінскім урадам дасягнута поўная згода аб таваразамене.

Усе тавары і прадукты, якія вывязецца з Украіны ў Беларусь, павінны прахадзіць праз Кіеўскую Беларускую Тарговую Палату і там рэгістравацца пры ўмове паніжэньня пошліны і цэн на самыя тавары.

Згода міністра прамысловасьці і таргоўлі ўкраінскай дзяржавы на рэгістрацыю і вываз тавараў толькі праз Кіеўскую Беларускую Тарговую Палату паставіла на чаргу пытаньне аб вагонаабмене і па гэтым пункце з міністрам дарог дасягнута згоднасьць.

Далейшае заданьне Цэнтральнай Беларускай Тарговай Палаты ў Менску—аканчальна замацаваць усе гэтыя згоднасьці праз умову з нямецкімі окупацыйнымі ўладамі. Прынцыпіяльную згоду на ўсе гэтыя пункты дэлегацыя ад Палаты мела, выяжджаючы з Менску 3-га верасьня г. г. Пытаньні аб рэквізыцыі тавараў, ідучых на адрэс Цэнтральнай Тарговай Палаты і аб рэгістрацыі тавараў, што вывозяцца з Беларусі на Украіну Цэнтральнаю Палатай, разьвязана было ў Менску памысьльна.

Аб беларускім унівэрсытэце.

У аўторак 24 верасьня ў кватэры прафэсара М. Даўнар-Запольскага, пры учасьці прафэсара акадэміка Карскага, беларускіх дэлегатаў Я. Варонкі і прафэсара К. Сталярова, адбылася нарада аб уладжаньні ў Менску Беларускага Унівэрсытэту. Прафэсар Карскі выказаў свой праект уладжаньня Беларускага Унівэрсытэту і яго статут. Сьмета унівэрсытэту будзе разгледжана земствамі і месцкімі самаупраўленьнямі Беларусі а так сама Енаральным Загадам 10 арміі.

Прадстаўнікі «Злучнасьці» у кс. Лозінскага.

У сераду 25 верасьня г. г. біскупу менскаму прадстаўляўся урад Беларускай Каталіцкай Дэмократычнай злучнасьці. Біскуп на прамовы старшыні ураду, пана Р. Свірмунта, адказаў, што ён шчыра памагае усялікім злучнасьцям хрысьціянскага кірунку і абяцаў у чым толькі патрэба ахвотне дапамагаць у справах злучнасьці. Урад наагул вынес з пагляду пастыра задавальняючае ўражаньне і цакладае надзею, што маючы новага так зацнага духоўнага прыхільніка Злучнасьць цяпер лягчэй распачнець сваю працу на карысьць, маральнае узмацаваньне і адраджэньне каталіцкага люду ў тутэйшай дыэцэзыі, дзе ён становіць па местах большасьць а па вёсках адналітае насяленьне як у значэньні бытавым, так і па сваей роднай беларускай мове. Дзеля гэтага урад Злучнасьці спадзяецца, што па вясковых парахвіях мяйсцовыя ксяндзы не занядбаюць арганізаваць так сама сялянскі люд у нацыянальныя хрысьціянскія злучнасьці, каб ён парэшце зразумеў што калі ёсьць Беларусь, то, значыць, ёсьць і мова беларуская і што ў гэтай мове ён можа, мае права і боскі абавязак выказываць свае думкі і пагляды і не патрабуе ламаць свой язык вучыцца з прымусу няроднай мовы. Перад разьвітаньнем урад Злучнасьці дзякаваў Пастыру за номінацыю патронам злучнасьці вядомага петраградзкага професара філёзофіі ксяндза Абрантовіча, шчырага і сьведамага беларуса. На разьвітаньні Пастыр яшчэ раз сам абяцаў стаяць у абароне свабоднай працы Злучнасьці.

За прылучэньне да Украіны

Земляўласьнікі тых часьцей Беларусі, што пакідаюцца немцамі, глаўным чынам Магілёўшчыны зьвярнуліся да Украінскага ураду з прозьбай прылучыць гэтыя землі да Украіны.

У Вільні і ваколіцах.

× **Хлебныя карты рэзэрвісткам** на месяц кастрычнік гэтага року аддаюцца ў аддзел III, пакой 143, Домініканская 2. Жонкам запасных хлебныя карткі ў далейшыя дні:

для 4 цыркулу	— 8 і 9	кастр.
„ 6 „	— 9 і 10	„
„ 7 „	— 10 і 11	„
„ 8 „	— 11 і 12	„
„ 1 „	— 14	„
„ 5 „	— 15	„
„ 3 „	— 16	„
„ 2 „	— 17	„

Хто не ўзяў у гэтыя дні карткі, можа іх узяць яшчэ 18 і 19 кастрычніка.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошнія дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
3–4	+ 13,0°	+ 2,2°
4–5	+ 9,9°	+ 1,1°
5 6	+ 9,9°	+ 6,9°
6–7	+ 12,5°	+ 4,0°

З усяго Краю.

РЫГА. У тутэйшым парку Прыкусаў знайдзены труп 35 летняга мужчыны з ранамі. На берaзе возера Дамм знайдзены труп незнаёмай жанчыны ад 25 да 30 гадоў з доўгай русай касой вісячы на дрэве.

КАШЭДАРЫ. Двое сялянскіх мальцаў, Мацей Казлоўскі 12 гадоў і Язэп Сасноўскі 13 гадоў, знайшлі ў Дубялках на пашы неразарваўшуюся гранату і пачалі бавіцца ей. Яна разарвалася і парвала на кускі Мацея Казлоўскага. Сасноўскэму адарвала нагу і нарабіла цяжкіх ран, ад якіх ён за тры гадзіны памёр.

КОУНА. 29 кастрычніка вечар. у 8 гадз. каля тартака Левіна трое невядомых напалі на рускага ваенна-палоннага і зранілі яго нажом так цяжка, што яго трэба было адправіць у лазарэт.

КОУНА. На Вілкомірскай вул. на 1 кастр. у 3 гадз. ночы зладзеі укралі з спальні аднаго купца яго опратку, паложаную на крэсьле. Следзтва паказала, што зладзей яшчэ перад прыходам гаспадара закраўся у яго кватэру, схаваўся і абакраў пасьля спаўшага.

БЕРШУПЫ. (Уладаслаўск. пав. У Марцы гэтага году зладзеі праз саломенную страху улезьлі у сьвіран селяніна Урбановіча, зламалі куфар і выкралі стуль опраткі, палатно сукно і іншыя рэчы. З вісеўшай там збруі яны выразалі кускі скуры на пад швы. Зладзеі доўга былі ня ведамы. Гэтымі днямі у Філіпах у Шаўца Масквітэс Урбанович знайшоў кусок скуры ад збруі, якая, з усяго відаць, была выразана у яго. Гэтую скуру аддаў шаўцу 17 летні Станкевіч з Энсулішак. Суд засудзіў Станкевіка на 6 месяцаў турмы.

ГРОДНЯ. Тутэйшая электрычная фабрыка дайшла да астатку сваіх сіл. З недастачы газы запытаньне на электрычнасьць найбольш з боку вертаючыхся уцекачоў узрастае усё больш і больш. Мяставае самаўпраўленьне праектуе устройства двух малых цэнтраляў на прадмесьцях.

РАЧКІ. У ночы на 20 верасьня чвора незнаёмых людзей цяжка ранілі гаспадара Антона Сукоўскага Следзтва дагэтуль ня выкрыла ліхадзеяў.

ГРОДНЯ. Маісей Баес на Індурскай 13 закупіў для вывазу 19 цэнт. жыта. Яго засудзілі на 3 месяцы турмы і штрафам на 900 мар. Жыта сконфіскована.

ШЧУЗІНОУ (Гродзен. п.) Трое тутэйшых жыхароў з сеялі жытам часьць артылерыйскага палігону. Гродзенскі міравы суд засудзіў кожнага на 300 марак штрафу.

Весткі з Расеі.

ШТОКГОЛЬМ. 4.X (В.Т.Б.). Тэлеграма з Масквы „усім, усім, усім“ зьвертае ўвагу на опэрацыі саюзьнікаў на Мурмане і называе іх контррэволюцыёнымі. Урад саветаў прызнае гэтыя опэрацыі раўнаважнымі з аб'яўленьнем яму вайны і прызывае ўсіх мужчын бараніць плёны рэвалюцыі.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН (В.Т.Б.) **Урадова.** Імпэратар назначыў канцлерам прынца Макса Бадэнскага, штатс-сэкрэтарамі без портфэля Шэйдэмана і Грэбэра. Штатс-сэкрэтар унутраных спраў Вальраф ідзе ў адстаўку і будзе заменены клерыкальным дэпутатам. У галаве наваствоpанага дэпартамэнту працы стане старшыня профэсыянальных саюзаў дэпутат Бэнэр. Прускім міністрам гандлю будзе замест Сідова член парлямэнту Фышбэк.

Увага. Новы канцлер гэта зродны брат цяперашняга гэрцога бадэнскага. Ён радзіўся 10 ліпня 1867 году. Ён доктар права і да апошняга часу старшыня Бадэнскай Палаты Паноў. Сваей мовай 14 гр. прошлага году ён зьвярнуў на сябе агульную увагу.

БЭРЛІН. 5 X. Праграма партыі вялікшасьці, што творыць новы ўрад, паміж іншым мае гэта: «Гатоўнасьць прылучыцца да саюзу раўнапраўных народаў, доўгі мір; абавязак для кожнае дзяржавы ўсе спорныя пункты аддаваць на мірнае пасрэдніцтва; свабоду мора; разаружэньне сухапутнае і морскае; паміжнародная экономічная свабода; паміжнароднае соцыяльнае правадаўства; адбудаваньне Бэльгіі і ўмова аб адплаце; ўсходнія мірныя ўмовы не павінны быць перашкодаю да заключэньня агульнага міру; у Балтыцы, Літве і Польшчы творацца народныя прадстаўніцтвы на шырокай дэмакратычнай аснове а таксама цывільныя ўрады; Эльзас Лётарынгія робіцца саюзнай нямецкай дзяржавай з поўнай аўтономіяй; правядзеньне зараз жа выбарнай рэформы ў Прусіі.

БЭРЛІН. 4.X. «Vorwärts» піша: «Аб курсе новага ўраду яшчэ вядуцца перагаворы. Нямеччына павінна прызнаць вялікія добрыя стораны мірнага саюзу вольных раўнапраўных народаў і дзеля гэтага павінна быць гатовай прынясьці ахвяры. Аднолька-ж гэта не павінна азначаць сьляпога падчыненьня Нямеччыны. Хай ворагі назавуць цану, якую павінен заплаціць кожны народ і ад якіх жаданьняў ён павінен адказацца, каб дастаць выгады доўгавечнага міру. Тады нямецкі народ пастановіць, ці можа ён згадзіцца на гэтыя пропозыцыі. Хай ворагі дзеля таго ўжо сёньня ведаюць, што хоць нямецкі народ гатовы далёка ісьці насустрэчу, аднолька-ж ёсьць граніцы, якія ня могуць быць пяройдзенымі“.

БЭРЛІН. Нямецкія партыі аўстрыяцкага парлямэнту пастана-

Здарэньні у Нямеччыне.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 5 X. Нямецкі урад зьвярнуўся да прэзыдэнта Злучаных Станаў Вільсана з прадлажэньнем узяць у свае рукі пасрэдніцтва паміж усімі ваюючымі дзяржавамі для заключэньня міру. Нямецкі урад становіцца на грунт праграмы, якую паставіў Вільсон у сваей прамове 27 верасьня. Каб скончыць далейшае праліцьце крыві, нямецкі урад прадлагае зрабіць агульнае замірэньне на сухапуці, вадзе і паветры.

БЭРЛІН (В.Т.В.). 5 X. Імпэратар зьвярнуўся з адозвай да арміі і флоту, у якім паміж іншым кажа: «у часе самых цяжкіх бітваў на заходнім фронце здарыўся разлом мацэдонскага фронту. Вашы фронт не зламаўся і застанецца такім. У згодзе з маімі саюзьнікамі я яшчэ раз прадлажыў ворагам мір. Аднолька-ж мы пададзём руку толькі пачэснаму міру. Гэта нашы абавязак да гэрояў што аддалі жыцьцё бацькаўшчыне. Гэта мы абавязаны да нашых патомкаў. Ці будзе зроблены мір, яшчэ ня ведама. Да таго часу мы не павінны аслабець. Мы павінны прадаўжаць, як дагэтуль, усімі сіламі супраціўляцца штурму ворага».

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 5.X. **Рэйхстаг.** Рэйхсканцлер прынц Макс Бадэнскі меў прамову, ў якой разьвіў праграму партыі вялікшасьці Рэйхстагу (глянь тэлеграму у аддзеле: «З усяго сьвету»). Рэйхсканцлер абяцаў хуткае правядзеньне дэмократычнай рэформы выбарнага права ў Прусіі, поўную аутономію Эльзас-Лётарынгіі. Ён прадаўжаў: „З 30 верасьня пачынаецца новая эпоха нямецкае гісторыі. Нашыя высілкі за мір патрабуюць зьеднаньня усіх партыяў і усіх слаёў. Чатыры гады самай крывавай барацьбы з пераможнымі сіламі ворага ляжаць за намі. Калі гэтага будзе вымагаць нашая чэсьць і свабода і шчасьце нашых патомкаў, то мы гатовы прынясьці яшчэ большыя ахвяры. Ня гледзячы на без перарыву цягнучыяся штурмы ворага, нашы фронт не ўздрыгнуў. Веда нашае сілы дасьць нам права яшчэ раз прадлажыць заканчэньне вайны, калі гэта не пашкодзіць нашай чэсьці. Мы дабіваемся пачэснага міру для усяго чалавецтва (ажыўленае «браво» з усіх бакоў, крыкі незалежных соцыялістаў).

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 4.X. Члены Рэйхстагу Грэбэр, Шэйдэман і Эрцбэргэр назначаны статс-сэкратарамі без портфэляў. Дэпутат Бауэр назначаны штатс-сэкрэтаром міністэрства працы. Штатс-сэкрэтаром міжнародных спраў назначаны быўшы міністар колёній Сольф.

вілі зрабіць запытаньне Імперата ру, ці ня згодзіцца ён зрабіць Аўстрыю саюзнай дзяржавай.

БУДАПЭШТ. Орган ураду «Pester Lloyd» кажа: Цэнтральныя дзяржавы прадаўжаюць дыплёматычнае наступленьне на карысьць міра. Яны ведаюць, што грамадзкая думка іхных народаў служа ім у гэтай справе моральным падтрыманьнем.

ВЕНА. Клюб нямецкіх соцыяльдэмакратаў парляманту вынес рэзолюцыю ў якой прызнаець права на самаазначэньне славянскім і романскім народам Аўстры, але безумоўна адкідае падчыненьне нямецкіх зямель нова-створанай славянскай дзяржаўнай арганізацыі; для нямецкіх часьцей Чэхіі вымагаецца на аснове права самаазначэньня поўнае незалежнасьці.

БЭРЛІН. Партыя нацыянал лібэралаў прымкнула да большасьці Рэйхстагу і будзе разам тварыць урад.

Заместа статс-сэкрэтара Вальрафа, які пайшоў у адстаўку, назначаецца клерыкал Бэльль.

БЭРЛІН. Аб угальным крызысе ў Італіі паведамляе паміж іншым «Daily Express», што з недастачы другога апалу закуплена 50 тысяч тонн з аліўкавых гаяў. Хто ведае значэньне аліўковага дрэва ў Італіі, той зразумее, кажа газэта, што гэтая вестка вызывае плач у італьянцаў!

БЭРЛІН. 6.Х. У найбліжэйшы час будуць у Аўстры пароблены крокі для ўведзеньня нацыянальных аўтономій. Будзе складзена народнае міністэрства Лямаша або барона Бэка.

ВАРШАВА (В.Т.Б.). 2.Х. Новы міністар прэзыдэнт Кухажэвскі выказаў што ён лічыць органам польскай палітыкі дзяржаўную раду, з каторай урад будзе падтрымовываць блізкія адносіны. Унешнія справы будуць весьціся у згодзе з партыямі, аднольна-ж не публічна. Урадовая заява падгатаўляецца. Першае паседжаньне дзяржаўнае рады будзе цераз два тыдні.

МАДРЫД. Гішпанскі кароль захвараў на гішпанскую трасцу.

Выпадкі у Баўгарыі.

СОФІЯ. 4.Х. (В.Т.Б.). Сёньня быў урачысты ўсход на трон караля Барыса. Ен у сваей палітычнай прамове выказаў надзею, што Баўгарыя такі даб'ецца свайго зьеднаньня.

СОФІЯ. 4.Х. (В.Т.Б.). Кароль Фэрдынанд адказаўся ад трону на карысьць свайго сына Барыса, які ўступіў правіць.

СОФІЯ. 2.Х. Сёньня падпісаны акт заміраньня паміж Баўгарыяй і саюзьнікамі. А мірных умовах даюць такія драбніцы: дэмобілізацыя баўгарскй арміі; стаячыя. на заход ад Скопле баўгарскія войскі ідуць у палон; Баўгарыя аддае ўсе землі занятыя з 1915 г., але можа дастаць Дабруджу да Кобанэн; мацэдонскае пытаньне застаецца адкрытым да агульнага міру; немцы і аўстрыякі выходзяць з Баўгары на працягу 4 тыдняў; засцярагаецца недакранасьць і сувэрэнітэт Баўгары.

СОФІЯ. 5.Х. (В.Т.Б.). Парлямэнт у прадаўжаўшымся 5 гадзін патайным паседжаньні аднагалосна выказаўся за заміраньне і пахваліў крокі ўраду.

СОФІЯ. Сюды прыехаў грэцкі міністар-презыдэнт Вэнізэлёс і меў доўгую гутарку з Малінавам.

БЭРЛІН. Вестка «Извѣстія», што нядаўно памёршы баўгарскі пасол у Бэрліне Руцоў ў 1917 гаду рабіў патайныя паездкі ў Штокгольм і вёў перагаворы з расейскім паслом Неклюдовым не адказуе праўдзе.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкія апавяшчэньні.

4.Х. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: У Фландрыі ворагі атакавалі з вялікімі сіламі між Гоклед і Гозэляр. Пры дарозе Стадэн—Розэляр ён урваўся ў нашую лінію, але контрагакай быў выкінут, страціўшы пры гэтым да 100 палонных. На фронце Камбрэ ў малых стычках мы ўзялі каля 70 палонных.

Фронт генэрал-ан шэфа ф. Бэн'а: На шырокім фронце між Лё-Катле і Сан-Катлен англійцы прадаўжалі концэнтрыраваныя штурмы. Спачатку ворагу удалося узяць Лё-Катле, прасунуцца да Бо-Ровуар і Монбрыен і варвацца у Зэкгар. Абапол ЛёКатле мы выкінулі ворага за яго уласныя пазыцыі. Бо-Ровуар узяты йзноў. Так сама Монбрыэн. Зэкгар пасьля майначных бітваў астаўся йзноў ў руках ворага В - чарам на поўдзень ад Сенкантэн сільныя варожыя штурмы адкінуты за нашыя лініі.

Фронт нямецкага Насьледніка: На Шмэн-дэ-Дам адкінута сільнае наступленьне італьянцаў. У Шампані французы і амэрыканцы атакавалі свежымі дывізыямі між Свіпы і Энь Усе атакі ворага адбіты. Узята каля 100 палонных. На поўнач. ад Сом Пю ворагу спачатку ўдалося узмацавацца на гарыстым ланцугу між Сэнтэг'ен і Сом Пю. Контратакай мы адкінулі ворага назад. На фронце між Орфэйі і Энь усе атакі ворага адбіты. На поўдзень Лёрі і на паўдзёны заход ад Монтуа былі вельмі заўзятыя бітвы. Вораг адкінуты. Заўзятыя атакі ворага між Энь і лесам Аргонь адбіты.

Мы зьбілі ўчора 25 непрыяцельскіх самалётаў і 7 прывязных балёнаў.

5.Х. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: У Фляндрыі адбіты атакі ворага паміж Гоклед і Гозэляр. На ўсход ад Армант'ер вораг пасьледаваў за намі цераз Буагрэн'е, Фурн і Мэнль.

Фронт генэрал ан-шэфа ф. Бэн'а: Англійцы прадаўжалі наступленьні абапал Лё-Катле якое яны ўзялі свае сільныя штурмы. З Боровуар вораг выкінуты контратакай. На поўнач ад Сан-Кантэн французы атакавалі між Сэкгар—Гаркур. Яны ўзялі Гаркур Ледэн мы адабралі контратакаю. На іншым фронце варожыя штурмы разьбіліся перад нашымі лініямі.

Фронт нямецкага Насьледніка і ф. Гальвіца: Французы і італьянцы вялі концэнтрованыя атакі між Айет і Энь, якія адбіты. На заход ад Рэнс мы пакінулі нашую пярэднюю лінію між Прюгэ і Сэнт Мары а Пі незаўважавыя ворагам.

Днём вораг пасьледаваў за намі цераз Прюнэ Донтрыян і Сэн Супле. У Шампані мы ўзялі контратакай астаўваўшыяся яшчэ ўчора у ворага вышыні на поўнач ад Сомпі. Пасьля вельмі моцнай артылерыйскай падгатоўкі вораг атакаваў абапал Сомпі. З цяжкімі стратамі ён адкінуты. Абапал Энь артылерыйская бітва. Між Аргонамі і Маас амэрыканцы ўчора без удачы вялі атакі. У Аргонах адбіты яго штурмы шмат разаў. На захад ад Эр ён прасунуўся да вышыні Экзомон. Абапал Жэнь адбіты усе атакі ворогаў проціў нашых пазыцый. Найбольш цяжкілі былі амэрыканскія штурмы проціў лесу Канэль. Крывавыя страты амэрыканцаў надзвычайна высокія.

Мы зьбілі за апошнія 2 дні 65 варажых самалётаў. Паручнік Боймэр атрымаў сваю 40 і 41 перамогу.

6.Х. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: Ажыўленыя разьведкі.

Фронт генэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: У запрошлую ноч мы ачысьцілі дугу між Крэв-Кэр і Борувуар. Французы і англійцы прадаўжалі свае штурмы між Ля-Катле і Сан-Кантэн. Борувуар і Монгрубэн засталіся ў іх руках. На іншым фронце іх штурмы адкінуты. Між Сом Пі і Ліры французы і амэрыканцы прадаўжалі свае штурмы з вялікімі сіламі. Мы затрымалі свае пазыцыі спаўна супроць да 15 разоў паўторных штурмаў. Ворагі затрымалі тутака надзвычайна цяжкія страты.

Фронт ф. Гальвіца: Паміж Аргонамі і Маас амэрыканцы прадаўжалі свае моцные штурмы. На На ўсход ад Экзорман ворагу ўдалося прасунуцца блізка на 1 кілёмэтр. Ворагу ўдалося ўдзёрціся ў лес Фэ. На ўсіх іншых мяйсцох ворагі былі адкінуты..

Мы зьбілі ўчора 37 самалётаў і 2 балёны ўвязаныя. З варожае эскадры, што атакавала Фальц, мы зьбілі 5 самалётаў.

Палудзенна-усходні тэатр:

Мы вылучылі з баўгарскай арміі біўшыяся там войскі і скіравалі іх ў назначанае для збору мейсца.

Азыяцкі тэатр.

У Палестыне біўшыяся сярод турак нямецкія батальёны павінны быць узятымі назад на поўнач ад Дамаску.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

БЭРЛІН. Рускі дрэднаўт «Воля» і іншыя закончаныя ў часе вайны ваенныя караблі перайшлі да нас з згоды маскоўскага ўраду. Караблі гэтыя будуць ужыты для абароны морскіх праліваў.

ВЕНА. 4.Х. (В.Т.Б.). Албанскі тэатр. Адход нашага войска робіцца плянова і без перашкоды ворага на новыя лініі.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 4.Х. Навакол Англіі нашыя падводныя лодкі ізноў затапілі 23·000 тонн; паміж імі дзве цыстэрны.

Друкавана ў друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.